# ЗАЯВА ПЯТАГА БАЛОНСКАГА ПАЛІТЫЧНАГА ФОРУМА

Парыж, 25 траўня 2018 года

Мы, міністры, адказныя за сферу вышэйшай адукацыі, і кіраўнікі дэлегацый, устаноў і арганізацый, якія ўдзельнічаюць у Пятым Балонскім палітычным форуме, рашуча пацвярджаем каштоўнасць вышэйшай адукацыі для жыцця грамадства. Ва ўмовах усё большай узаемазлучанасці нашых супольнасцяў і інтэрнацыяналізацыі свету вышэйшая адукацыя і навуковыя даследаванні з'яўляюцца найважнейшым фактарам нашага будучага росквіту, міру і прагрэсу. Уключэнне вышэйшай адукацыі ў дзейнасць усяго грамадства мае жыццёва важнае значэнне ў той час, калі ўсе нашыя супольнасці сутыкаюцца з такімі выклікамі як сацыяльная ізаляцыя, беспрацоўе сярод моладзі і гендэрная няроўнасць, а таксама нарошчванне папулізму, вымушанае перамяшчэнне народаў, змяненне клімату і самога будучага нашай планеты. Балонскі палітычны форум, які прайшоў у Парыжы ў траўні 2018 года, забяспечыў важную магчымасць для шматбаковага дыялогу і абмену ідэямі паміж удзельнікамі Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ЕПВА), міністрамі з іншых краін свету і шэрагам зацікаўленых бакоў.

Вышэйшая адукацыя мае даўнія традыцыі ўмацавання міжнародных сувязяў, і яе гісторыя змяшчае шмат прыкладаў эфектыўнага партнёрства паміж нашымі краінамі. Установы вышэйшай адукацыі і зацікаўленыя бакі з'яўляюцца адным з ключавых фактараў міжнароднага супрацоўніцтва праз мабільнасць персаналу і студэнтаў, праграмы міжнароднага навуковага партнёрства, транснацыянальную адукацыю і супрацоўніцтва ў вырашэнні глабальных праблем. Такім чынам, вышэйшая адукацыя забяспечвае трывалую аснову для ўзаемнага ўзбагачэння ідэямі і перадавой практыкай, якія спрыяюць вырашэнню глабальных пытанняў.

ЕПВА з'яўляецца прыкладам такой прагрэсіўнай практыкі, калі можа быць дасягнута многае праз аб’яднанне вялікай колькасці краін на добраахвотнай аснове. Гэтая прастора забяспечвае структуру і практычныя інструменты, які мадэрнізавалі і палепшылі якасць вышэйшай адукацыі: вынікі навучання, Дадатак да дыплома, рамкі кваліфікацый і інструменты паляпшэння і забеспячэння якасці. Аналагічныя падыходы былі ўведзеныя іншымі рэгіёнамі Паўднёва-Усходняй Азіі, Афрыкі, Міжземнамор'я і Лацінскай Амерыкі, якія ўсе актыўна ўдзельнічаюць у распрацоўцы нацыянальных або рэгіянальных інтэграцыйных інструментаў, такіх як сістэмы якасці і пераносу крэдытаў і рамкі кваліфікацый, у мэтах умацавання якасці і палягчэння працэсаў унутрырэгіянальнага прызнання і мабільнасці. ASEM з'яўляецца прыкладам ініцыятывы паспяховага транснацыянальнага супрацоўніцтва паміж Азіяй і Еўропай, якім з’яўляецца і партнёрства паміж Афрыкай і ЕС, што робіць відавочным выдатныя магчымасці супрацоўніцтва на абодвух кантынентах.

Мы лічым, што Балонскі палітычны форум, пры падтрымцы міністраў ЕПВА і міжнародных арганізацый, можа прывесці да больш сістэмнага і ўстойлівага ўзроўню міжнароднага

супрацоўніцтва. Такое супрацоўніцтва павінна ўлічваць разнастайнасць нашых рэгіёнаў, уключаючы розныя ўнутраныя сацыяльныя і палітычныя кантэксты, у якіх фармуецца вышэйшая адукацыя, і яе шырэйшае геапалітычнае вымярэнне. Яна павінна ставіць перад сабой рэалістычныя мэты і задачы, якія могуць быць дасягнуты ў духу ўзаемаабмену і ўзаемнага навучання. Асобам, адказным за вышэйшую адукацыю, важна ўмець слухаць, вучыцца і прымаць удзел у вырашэнні агульных пытанняў, якія ўключаюць у сябе якасць, акадэмічную свабоду, удзел студэнтаў у жыцці ўстаноў вышэйшай адукацыі, сацыяльную інклюзію, статус, аўтаномію і пашырэнне ролі ўстаноў вышэйшай адукацыі. Пяты Балонскі палітычны форум ініцыяваў глабальную палітыку дыялогу, якая мае сваёй канкрэтнай мэтай вырашэнне дзвюх з вышэйпазначаных агульных клопатаў - сацыяльная інклюзія і ўзмацненне грамадзянскай ролі вышэйшай адукацыі.

Хоць працэнт насельніцтва, якое атрымлівае вышэйшую адукацыю, расце ў большасці краін свету, сацыяльная інклюзія і пашырэнне доступу да вышэйшай адукацыі па-ранейшаму з'яўляюцца глабальным выклікам. Сацыяльна неабароненыя групы, уключаючы мігрантаў і бежанцаў, сутыкаюцца з дадатковымі праблемамі не толькі ў доступе да вышэйшай адукацыі, але і ў яе завяршэнні. Таму абмеркаванне сацыяльнай інклюзіі заключаецца не толькі ў забеспячэнні справядлівага доступа да навучання, але таксама ў дасягненні поспеху ў навучанні - гэта ўключае ў сябе скарачэнне адсева студэнтаў, паслядоўнае засваенне праграмы навучання, паспяховае яе завяршэнне і добрыя здольнасці для працаўладкавання для ўсіх нашых студэнтаў і выпускнікоў.

Сучасныя сацыяльныя выклікі патрабуюць мясцовага, рэгіянальнага і глабальнага ўдзелу. Вышэйшыя навучальныя ўстановы маюць жыццёва важнае значэнне для падтрымкі эканомікі свайго населенага пункта, рэгіёна або краіны. Мы згодныя з тым, што яны могуць і павінны адыгрываць яшчэ большую сацыяльную, культурную і кіруючую ролю ў сваіх супольнасцях. У гэтай жыццёва важнай моцнай грамадзянскай актыўнасці ўстановы вышэйшай адукацыі могуць садзейнічаць умацаванню сацыяльнай згуртаванасці праз фарміраванне ў студэнтаў каштоўнасцяў, навыкаў і здольнасцяў, якія садзейнічаюць грамадзянскаму ўдзелу, сацыяльнай інклюзіі, устойліваму развіццю і глабальнаму грамадзянству.

Мы, міністры, адказныя за сферу вышэйшай адукацыі, бярэм на сябе абавязак падтрымліваць гэты пастаянны паспяховы міжрэгіянальны дыялог па пытаннях, якія прадстаўляюць агульны інтарэс для палітыкаў, зацікаўленых арганізацый, студэнтаў, супрацоўнікаў і ўстаноў вышэйшай адукацыі. Мы прапануем стварыць у рамках наступнай Рабочай праграме Балонскага працэса на 2018 - 2020 гады Глабальную рабочую групу, якая будзе паэтапна развіваць дадзеную павестку. Мы запрашаем краіны-удзельнікі выказаць сваю зацікаўленасць у правядзенні штогадовых семінараў на высокім узроўні для палягчэння дыялогу па пытаннях сацыяльнай інклюзіі і пашырэння ролі вышэйшай адукацыі. Мы таксама даем абавязак працягваць супрацоўніцтва, абмен досведам і пошук мэт на будучыню шляхам правядзення сумесных семінараў, канферэнцый і надзвычай важных мерапрыемстваў па калегіяльным навучанні, якія прапануюць нестандартныя адказы на агульныя выклікі. У мэтах далейшага развіцця міжнароднага партнёрства, мы заклікаем установы вышэйшай адукацыі выкарыстоўваць усе магчымасці, якія прадстаўляюцца праграмамі двухбаковага супрацоўніцтва і праграмамі шматбаковай мабільнасці, такімі як праграма Erasmus+, якую спансуе ЕС, або даследчыя праграмы Horizon 2020, а таксама супрацоўнічаць у вырашэнні нашых агульных праблем.